Капотэ (Capote) Трумэн (30.9.1924, г. Новы Арлеан, ЗША — 25.8.1984), амерыканскі пісьменнік. Дэбютаваў раманам «Іншыя галасы, іншыя пакоі» (1948). Адзінота і чалавек, мара і рэальнасць амер. жыцця, злачыннасць і грамадства — асн. тэмы яго твораў (зб. апавяд. «Дрэва ночы», 1949; аповесці «Лугавая арфа», 1953; «Снеданне ў Тыфані», 1958; «Самаробныя дамавінкі», 1980; дакумент. раман «Звычайнае забойства», 1965). Аўтар аўтабіягр. апавяданняў (зб. «Музыка для хамелеонаў», 1980), эсэ, нарысаў, дарожных нататак. У творах выкарыстоўваў гатычныя матывы, гратэск 1 фантасмагорыю, яны адметныя лірызмам, высокім стылістычным майстэрствам і камерным псіхалагізмам.

Тв:. Рус. пер. — Один из путей в рай. М., 1967; Голоса травы. М., 1971.

Літ.: Писатели США М., 1990.

Т. Я. Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ